# ВОДЗЫЎ

**на аўтарэферат дысертацыі Талмачовай Святланы Аляксандраўны "Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)", прадстаўленай на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя**

Змест дысертацыі "Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)", прадстаўленай на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя, адпавядае заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.

Актуальнасць тэмы не выклікае сумненняў. У першую чаргу яна абумоўлена адсутнасцю ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі абагульняючай працы, прысвечанай аналізу пераўтварэнняў у аграрнай сферы Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст. Нягледзячы на вялікую ўвагу беларускіх гісторыкаў да працэса мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ў пазначаны перыяд, вывучаліся толькі асобныя яе аспекты. Таму распрацоўка праблемы, заяўленай у якасці тэмы дысертацыі, дазволіць у значнай ступені запоўніць існуючыя прабелы. Сістэматызацыя розных падыходаў дазволіць больш глыбока ўсвядоміць і асэнсаваць фенамен аграрнай палітыкі Расійскай імперыі на тэрыторыі беларускіх губерній, стымулюе творчы пошук і паспрыяе ўзмацненню інтарэсу да беларускай аграрнай гісторыі. Неабходнасць аналізу дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўраду вызначаецца таксама прыярытэтным характарам сельскай гаспадаркі і ўсяго аграпрамысловага комплекса ў агульным працэсе сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусі. Сацыяльна-арыентаваная аграрная палітыка разглядаецца ў якасці важнага фактара, які садзейнічае кансалідацыі баларускага грамадства.

Суіскальнік паспяхова справіўся з пастаўленай задачай і самастойна падрыхтаваў высокакваліфікаванае даследаванне, у якім упершыню ў беларускай гістарыяграфіі вывучана дзейнасць мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы сельскай гаспадаркі, акрэслены асноўныя накірункі іх дзейнасці. Дысертант правёў гістарыяграфічны аналіз разнастайных прац па тэме даследавання, на падставе якога выяўлена спецыфіка канцэптуальных навукова-метадалагічных падыходаў у адносінах да аграрнага сектара ў азначаны перыяд.

У працэсе даследавання былі атрыманы наступныя вынікі:

- выяўлены структурныя элементы дзяржаўнага механізму па ажыццяўленні аграрных рэформ 1861 г. і 1866 г. і раскрыты вынікі іх дзейнасці ў працэсе прававога суправаджэння ўсталявання новых сацыяльна-эканамічных адносін у беларускай вёсцы;
- усебакова паказана дзейнасць рэфармаваных губернскіх і створаных павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей у Віцебскай,

Магілёўскай і Мінскай губернях, а таксама павятовых па чыншавых справах прысутнасцей;

- даказана, што ўвядзенне інстытута земскіх начальнікаў па правобразу міравых пасрэднікаў 1861–1863 гг. не адпавядала рэаліям часу;
- ахарактарызаваны кірункі ўзаемадзеяння павятовых і губернскіх землеўладкавальных камісій, губернскіх прысутнасцей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з’ездаў у ходзе рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы;
- упершыню у гістарычнай навуцы выяўлены асаблівасці стварэння і функцыянавання мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрных пераўтварэнняў;

Такі шматгранны падыход да вырашэння навуковай праблемы дазволіў выйсці на новы якасны ўзровень у вырашэнні пастаўленых даследчых задач.

Абгрунтаванасць і верагоднасць заключных высноў, сфармуляваных у дысертацыі, забяспечаны перш за ўсё выкарыстаннем значнай колькасці крыніц: фундаментальных абагульняльных прац па гісторыі Беларусі, манаграфій, прысвечаных адносна вузкім праблемам заяўленай тэмы ў іншых краінах, артыкулаў у перыядычным друку і зборніках, прац замежных аўтараў, апублікаваных выступленняў на навуковых канферэнцыях, брашур, літаратуры нарысавага характару, дысертацыйных даследаванняў, дакументаў і матэрыялаў, апублікаваных у розных зборніках і перыядычным друку. Пры напісанні дысертацыі выкарыстаны шматлікія дакументы, што захоўваюцца ў айчынных і замежных архіўных установах.

Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі прадстаўлены ў 84 публікацыях, з якіх 1 манаграфія (20,0 аўт. л.), 14 – раздзелы ў калектыўных навуковых выданнях, падрыхтаваных у сааўтарстве (19,4 аўт. л.), 21 – у выданнях, уключаных ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікаванння вынікаў дысертацыйных даследаванняў (15,9 аўт. л.), у тым ліку 2 – у замежных выданнях, уключаных у рэфератыўную базу данных Scopus і Web of Science (2,1 аўт. л.). Агульны аб’ём апублікаваных работ складае 78,8 аўт. л.

Дысертацыйнае даследаванне заслугоўвае станоўчай ацэнкі з пункту погляду яго практычнай значнасці, у прыватнасці наданні новага ракурсу даследаванням па аграрнай гісторыі Беларусі на аснове выяўлення сутнасці ўрадавай палітыкі, эфектыўнасці дзейнасці інстытутаў дзяржаўнага кіравання па яе рэалізацыі і ступені ўплыву на мадэрнізацыйныя працэсы ў сферы сельскагаспадарчай вытворчасці. Матэрыялы даследавання могуць быць запатрабаваны органамі дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь.

У аўтарэфераце адлюстраваны асноўны змест дысертацыі, яе структура, галоўныя вынікі і палажэнні, якія выносяцца на абарону. Ён поўнасцю адпавядае патрабаванням Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў, Інструкцыі аб афармленні дысертацыі і аўтарэферата. Талмачова Святлана Аляксандраўна заслугоўвае

прысуджэння вучонай ступені доктара мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,
доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Гужалоўскі

ПОДПИСЬ ______ УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник управления
организационной работы и
документационного обеспечения
______ Н.Б. Черкасс
«26» 04 20